# ТАЯМНІЦЫ ЖЫЦЦЯ
# І
# ТВОРЧАСЦІ
# М.ГАРЭЦКАГА

(ДА 125-ГОДДЗЯ
З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

# МаксімГарэцкі

**Класік беларускай літаратуры, пісьменнік; драматург, публіцыст, вучоны, педагог**



Нарадзіўся **18** лютага **1893**года
ў вёсцыМалая
Багацькаўка
Мсціслаўскага раёна
Магілёўскай вобласці ў сялянскайсям**’**і**,**дзе акрамя яго было яшчэ чацвёра дзяцей**.**



## Бацькі пісьменніка

Бацька служыў панам, маці не цуралася любой вясковай работы.



Бацькі Максіма Гарэцкага:
Іван Кузьміч (1856-1945) і Ефрасіння Міхайлаўна (1864-1935)

Пачатковыя веды набываў у школе граматы ў суседняй вёсцы ВялікаяБагацькаўка, потым– у двухкласным вучылішчы ў Вольшы,
што на Аршаншчыне.



Школа ў Вольшы,
дзе ў 1903-1908 гг. вучыўся Максім Гарэцкі



Свидѣтельство.

Оршанское Уѣздное Отдѣленіе Могилевскаго Епархіальнаго Училищнаго Совѣта симъ удостовѣряетъ, что крестьянинъ дер. Малая Богатьковка Мошковской вол. Мстиславскаго уѣзда Максимъ Ивановъ Горецкій, родившійся тысяча восемьсотъ девяносто третьяго года 6го февраля вѣроисповѣданія православнаго успѣшно окончилъ курсъ ученія въ Вольшанской образцовой второклассной школѣ Вольшанскаго прихода Могилевской губерніи Оршанскаго уѣзда въ 1905 году, а потому при отбываніи воинской повинности имѣетъ право на льготу 3 разряда, установленную пунктомъ 3 ст. 64 Устава о воинской повинности.

Г. Орша 1905 года іюня 10 дня.

Предсѣдатель Отдѣленія [illegible]

Члены Отдѣленія: [illegible]

Членъ-Дѣлопроизводитель [illegible]

Тип. Ш. А. Фридланда.

**Пасведчанне аб заканчэнні Вольшанскай узорнай двухкласнай школы. 1905 год**

## Вучоба і пачатак
## Літаратурнай дзейнасці

У **1908** годзе М.Гарэцкі скончыў вучобу ў Вольшы і атрымаў магчымасць быць настаўнікам, вучыць грамаце сялянскіх дзяцей.

У гэты час ён пачынае цікавіцца беларускай літаратурай і пачынае свядома карыстацца беларускай мовай.



У **1909** годзе М**.** Гарэцкі паступіў у Горы**-**Горацкае каморніцка**-**агранамічнае вучылішча**,** якое скончыў у **1913** годзе**.**

.




***Максім Гарэцкі – вучань каморніцка-агранамічнага вучылішча. Горкі, 1913 г.***

У **1912** годзеў газеце **«**Наша ніва**»,** якая выдавалася ў Вільні**,** пачалі з**’**яўляцца карэспандэнцыі**,** допісы**,** нататкі Гарэцкага**.**
**25** студзеня **1913** года там жа пад псеўданімам Максім Беларус было апублікавана яго першае апавяданне **«**У лазні **».**




***Рукапіс і першая публікацыя першага апавядання М. Гарэцкага «У лазні». 1913 г.***

Пасля заканчэння Горы-Горацкага вучылішча быў накіраваны ў Віленскую землеўпарадчую камісію. Працаваў каморнікам.

У Вільні адбылося знаёмства з ...Купалам, ...мБядулем, ...мыракам.



Фёдар Чарнышэвіч, Максім Гарэцкі (стаіць), Лявон Гмырак.




**Зборнікапавяданняў«Рунь»**
**(1914)**

## Ваенны час

Максім Гарэцкім меў намер авалодаць замежнымі мовамі, атрымаць атэстат сталасці і паступіць нагісторыка-філалагічны факультэт. Аднак, яму не ўдалося здзейсніць гэтыя планы.

У **1914** годзе Максіма Гарэцкага прызвалі ў царскую армію. Падчас службы ён адчуў усе цяжкасці салдацкага жыцця ваеннага часу: адразу трапіў на фронт,быў цяжкапаранены, лячыўся ў шпіталях



*Максім Гарэцкі ў шпіталі. Вільня, 1914 г.*

У **1916** годзе вучыўся ў Паўлаўскім ваенным вучылішчы ў Петраградзе, атрымаў званне прапаршчыка, праходзіў службу ў Іркуцку, Гжацку, адтуль франтавыя дарогі прывялі яго на Палессе. Неўзабаве зноў трапіў у шпіталь, доўга лячыўся



Максім Гарэцкі з братам Іванам. 1916 г.



Максім Гарэцкі – курсант Паўлаўскага ваеннага вучылішча. 1916 г.

Антываенны настрой пісьменніка, антыгуманны, антынародны характар імперыялістычнай вайны знайшлі сваё яркае адлюстраванне ў такіх яго творах ваеннага часу, як “Літоўскіхутарок”, “Генерал”, “Палонны”, “На этапе”, “Рускі”, “Прысяга”.

А запіскі Гарэцкага “Наімперыялістычнайвайне” (1914–1919) дазваляюць даследчыкам лічыць яго адным з пачынальнікаў ваеннай дакументалістыкі у беларускай прозе.





Камісаваны ў **1917** годзе
Максім Гарэцкі пераехаў у Смаленск, уладкаваўся на працу ў рэдакцыю газеты “Известия Смоленского Совета Рабочих,Солдатских и Крестьянских депутатов”, быў супрацоўнікам газеты “Звезда”.
Разам з братам Гаўрылам склаў і выдаў “Руска-беларускіслоўнік”(**1918**)– першывынікпрацы пісьменніка ў галіне лексікаграфіі.






У **1919** годзе пісьменнік пераехаў ў Мінск, потым у Вільню. Там выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах і ў Віленскай беларускай гімназіі.

Там жа пазнаёміўся з настаўніцай Леанілай Усцінаўнай Чарняўскай, якая неўзабаве стала яго жонкай, паплечніцай і вернай спадарожніцай на нялёгкім жыццёвым шляху.

**Леан**



*Жонка Максіма Гарэцкага*
*Леаніла Усцінаўна Чарняўская-Гарэцкая.*

Педагагічную працу Гарэцкі сумяшчаў з працай у газетах “Нашадумка”, “Беларускіяведамасці”, а таксама з літаратурнай творчасцю.

У гэты час былі напісаны аповесць “Дзве душы”, апавяданні “Апостал”, “Кросны”, “Панскаясучка”.

У **1920** годзе ўбачыла свет “Гісторыя беларускай літаратуры”,якая доўгі час была адзіным падручнікам для школ і ВНУ.



## Рэпрэсіі

У студзені **1922** года Максім Гарэцкі разам з іншым ідзеячамі беларускай культуры быў арыштаваны польскімі ўладамі як цяжкі палітычны злачынца.

Ён быў абвінавачаны ў прыналежнасці да партыі камуністаў, арганізацыі замаху на дзяржаўную ўладу, друкаванай і вуснай агітацыі, атрымліванні грошай ад камуністаў

Палітзняволеным пагражала смяротная кара альбо катарга. Але дзякуючы шматлікім пратэстам грамадскасці, арыштаваных выслалі з Вільні.



Сястра Ганна. 1919 год

**Самым трагічным момантам у сваім жыцьці лічыў гібель сястры Ганны**

У заяве Гаўрылы Гарэцкага, адрасаванай работнікам ОГПУ, ад 17 верасьня 1922 году (падчас яго першага арышту) чытаем: «15 сентября моя родная сестра Анна (...) везла мне первую „передачу“; она попала под трамвай — отрезало ногу (с раздроблением ступни), помяло таз, позвоночник и желудок: положение почти безнадежное». 19-га верасьня ў страшных пакутах яна памерла. Максім Гарэцкі прысьвяціў ёй «Хрэстаматыю беларускае літаратуры. XI век — 1905 год», Уладзімер Дубоўка — зборнік вершаў «Строма».

Непрацяглычас Гарэцкі знаходзіўся ў Латвіі, чытаў лекцыі на беларускіх настаўніцкіх курсах у Дзвінску.

У гэты перыяд ім былі створаны драматычныя абразкі "Салдат і яго жонка", "Свецкі чалавек", "Каменацёс", "Чырвоныя ружы".



**Абразкі"Свецкі чалавек", "Каменацёс", "Салдат і яго жонка".**
**Аўтограф, машынапісз рукапіснайпраўкай. 1922 год**

У **1923** годзе разам з сям’ёй пераехаў у Мінск. У Мінску ён чытаў лекцыі на рабфаку БДУ, выкладаў беларускуюмову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце БССР, выконваў абавязкі навуковага сакратара літаратурнай камісіі Інбелкульта, быў яго правадзейным членам.

**Сяброўскі білет члена праф**
**асветы БССР.**



З **1926**-га па **1928** год Гарэцкі ўзначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі.
Гэты перыяд жыцця быў вельмі плённым для пісьменніка.
Выйшлі з друку яго аповесці "У чым яго крыўда?", "Ціхія песні" ("Ціхая плынь"), зборнік "Досвіткі".
Пасля паездкі ў Сібір і на Далёкі Усход з'явіўся цыкл невялікіх апавяданняў "Сібірскія абразкі".
Апавяданні прысвечаны жыццю беларусаў-перасяленцаў.





Дом у Горках, дзе ў 1926-1928 гг. жыла
сям'я Максіма Гарэцкага

У **1928** годзе пісьменнік разам з сям’ёй вярнуўся ў Мінск. Працаваў вучоным спецыялістам Інстытута навуковай мовы Інбелькульта, застаўся на гэтай пасадзе і пасля рэарганізацыі інстытутаў у Акадэміюнавук

**18**ліпеня**1930**года пабезпадстаўным абві... належнасці да неіснуючага **«**Саюза вызвалення Белару... і асудзілі на **5** гадоў з высылкай у Вятк... працаваць чарцёжнікам**,** тэхнікам**-**каштар... землеўладкавальнікам**.**

Па заканчэнні тэрміна ссылкі ў **1935** годдзе Гарэцкі ўла... настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе ў... Пясочня Калужскай вобласці.







**ПаштоўкаМаксімаГарэцкага**
**да родных з Вяткі.**
**20 ліпеня1931 год**

У весь гэты час унес прыяльных і нават драматычных абставінах
пісьменнік не спыняў творчай дзейнасці, пісаў раман-хроніку
«Віленскія камунары», які лічыцца адным з найбольш значных твораў
беларускай літаратуры. Працаваў над задуманай яшчэ раней
«Камароўскайхронікай», сваеасаблівай сямейнай, сялянскай хронікай.
У гэты яж гады Гарэцкі працуе над сваімі апошнімі творамі «Лявон
іусЗадумекус»
І «Скарбы жыцця»,
У якіх адлюстроўваюцца яго роздумы аб сутнасці жыцця



У ноч на **4** лістапада **1937**года Гарэцкага зноў арыштавалі**,** а **5** студзеня **1938** года прыгаварылі да расстрэлу**.**
Справа па абвінавачаню М**.**Гарэцкага была адменена і спынена ў **1957** годзе Вярхоўным судомБССР**.**
Пісьменнік быў поўнасцю рэабілітаваны**.**



Апошні фотаздымак Максіма Гарэцкага. 1937 г.




**Памятны знак у г. Вязьма.**
**Магчыма, на гэтым месцы быў пахаваны М. Гарэцкі.**

Надпись на памятнике: «Предположительно на этом месте, где захоронены сотни известных и неизвестных людей, жертв политических репрессий, находится прах известного белорусского писателя, ученого и педагога Максима Ивановича Горецкого». Позже по инициативе духовенства г. Вязьмы рядом с памятником М.И. Горецкому был установлен деревянный поклонный крест-голубец.

## Ушанаванне памяці

Зараз на радзіме Максіма Гарэцкага створаны музей.Яго імнем названы бібліятэка ў Горках, вуліцыўМінску, Мсціславе, Горках.

У Мінску і Вязьме класіку беларускай літаратуры пастаўлены помнікі.



Барэльеф Максіма Гарэцкага ў Мінску.

**15** студзеня **1993** г**.** у вёсцы Багацькаўка Мсціслаўскага раёна паводле загаду Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і рашэння Мсціслаўскага раённага Савета народных дэпутата быў адкрыты Літаратурны музей Максіма Гарэцкага**.**












## Архіўпісьменніка

Асабісты архіў пісьменніка захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБН АН Беларусі пад нумарам **7** і складаецца з **119**адзінак захавання.

Рукапісы пісьменніка захоўваюцца таксама ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратурыі мастацтва



Яго творчасць знаходзіцца падпільнай увагай літаратуразнаўцаў. Рэгулярна арганізуюцца Гарэцкія чытанні, выдаецца Яго творчая спадчына. З **1997** года дзейнічае Міжнародны Фонд братоў Гарэцкіх.

































У красавіку **2016** года ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы адбылася прэм'ера спектакля "Дзве душы" паводле аповесці Максіма Гарэцкага ў пастаноўцы Мікалая Пінігіна, аўтарамі інсцэніроўкі аповесці з'яўляюцца Максім Клімковіч і Уладзіслаў Ахроменка.



...ахвярую сваім "я" ва ймя святога ўсім нам адраджэння"– такі наказ пакінуў Максім Гарэцкі нашчадкам, сэнс якога - не шкадуючы сіл рабіць усё магчымае і немагчымае ў высакароднай справе адраджэння нацыянальнай культуры.

# Дзякуй за увагу!